# АКТУАЛЬНАСЦЬ ТЭАРЭТЫЧНАГА МАТЭРЫЯЛУ ПА КУЛЬТУРЫ МАЎЛЕННЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Тарасюк Анастасія Мікалаеўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі
"Сярэдняя агульнаадукацыйная школа № 2 г. Хоцімска"
(г. Хоцімск, Беларусь)

Як вядома, тэрмін «культура маўлення» мае два значэнні: 1) сістэма камунікатыўных якасцей маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, багацце і разнастайнасць, дарэчнасць, чыстата і лаканічнасць); 2) вучэнне пра сістэму камунікатыўных якасцей маўлення [3].Так ці інакш бясспрэчна тое, што актуальнасць фарміравання культуры маўлення перааацаніць цяжка.

Асаблівай увагі ў плане развіцця культуры маўлення патрабуюць сучасныя школьнікі, якія галоўным сродкам зносін выбіраюць інтэрнэт. У такім выпадку зусім не можа весціся гаворка пра багацце, дакладнасць, правільнасць маўлення, бо ў вучняў няма жадання проста гутарыць адзін з адным.

Але задача настаўнікаў і заключаецца ў тым, каб скіраваць вучняў да авалодання літаратурнымі нормамі беларускай мовы. Гэтаму спрыяе ўдала падабраны матэрыял у школьным падручніку. Так, у вучэбных дапаможніках па беларускай мове 10 і 11-га класаў змешчаны карысны тэарэтычны матэрыял, аўтарам якога з'яўляецца М.В. Абабурка, доктар філалагічных навук, прафесар. Вядома, што з паняццямі «мова», «маўленне» і да т.п. вучні знаёмяцца намнога раней, але больш глыбокае вывучэнне пачынаецца менавіта ў старшых класах.

Пры вывучэнні тэмы *«Маўленне як працэс маўленчых зносін. Умовы маўленчых зносін»* у 10-м класе вучні знаёмяцца з тэрмінамі «камунікацыя», «сродкі камунікацыі», а таксама з разнавіднасцямі сродкаў камунікацыі – сродкамі масавай камунікацыі і сродкамі камунікацыі паміж асобамі [1, с. 8]. Вучні даведваюцца, праз якія віды маўленчай дзейнасці адбываецца працэс перадачы інфармацыі і моўныя зносіны людзей, як вырашаюцца камунікатыўныя задачы.

Прыведзены матэрыял карысныя не толькі таму, што дзеці адкрываюць для сябе новыя паняцці, але і таму, што яны праводзяць паралелі з рэаліямі жыцця: аналізуюць уласныя камунікатыўныя паводзіны, робяць высновы разам з настаўнікам аб тым, ці выконваюцца камунікатыўныя задачы ў паўсядзённым жыцці. Акрамя гэтага, змешчаныя пасля тэарэтычнага матэрыялу дадатковыя заданні дапамагаюць яшчэ глыбей засвоіць вывучанае. Так, адно з заданняў гучыць: «Да якіх сродкаў камунікацыі (масавых, паміж



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

асобамі) адносіцца інтэрнэт? Абгрунтуйце сваю думку». Канешне, вучні адкажуць без цяжкасцей на пытанне і абгрунтуюць думкі, хутчэй за ўсё без дапамогі настаўніка. Каштоўнасць задання заключаецца ў наступным: адказваючы на гэта пытанне, дзеці ўспомняць пра свае празмерныя зносіны ў ітэрнэце. І тут важна настаўніку сказаць, што ітэрнэт – гэта неад'емны сродак камунікацыі, але не адзіны, і ён не павінен браць перавагу над іншымі камунікатыўнымі сродкамі.

Наступная «сустрэча» старшакласнікаў з цікавым матэрыялам, аўтарам якога з'яўляецца М.В. Абабурка, адбудзецца ў 11-м класе пры вывучэнні тэмы «Дакладнасць і лагічнасць маўлення». Аўтар падае наступнае азначэнне паняцця: *дакладнасць маўлення – гэта адэкватнасць выказвання рэчаіснаму прадмету ці яго паняційнаму ўзнаўленню* [2, с. 207]. Безумоўна, дзецям цяжка з першага разу ўспрымаць і разумець значэнне падобных навуковых тэрмінаў, і таму Мікола Васільевіч тлумачыць, што трэба ведаць, каб маўленне было дакладным. Аўтар ілюструе сказы, у якіх адбываецца парушэнне дакладнасці маўлення. Напрыклад: «*Максім ужо дастаў з партфеля сшытак, але, пачуўшы голас бацькі, паклаў яго на стол і пайшоў да яго*». Як паказвае практыка, менавіта такія прыклады, якімі ілюструе М.В. Абабурка свае сцверджанні, выклікаюць у старшакласнікаў асаблівы прыліў станоўчых эмоцый, бо сказы, як правіла, утрымліваюць у сабе дабрадушны лёгкі гумар, што дазваляе на некалькі хвілін адцягнуць увагу дзяцей ад напружанай мысленчай працы. Важна тое, што дзецям дэманструецца не ўзорнасць, а, наадварот, памылковасць маўленчай культуры. Гэта дазваляе вучням не толькі прасачыць за тым, у выніку чаго адбываецца парушэнне маўлення, але і на аснове супастаўлення прааналізаваць уласныя маўленчыя паводзіны і ў будучым карэкціраваць сваё маўленне і маўленне субяседнікаў.

Пасля правіла змешчана практыкаванне, у якім вучням прапануецца выправіць памылкі ў прыведзеных выказваннях – прыкладах недакладнага маўлення. Трэба зазначыць, што матэрыял для дадзенага практыкавання таксама належыць М.В. Абабурку.

Так, з вялікім задавальненнем дзеці чытаюць двухсэнсавыя аб'явы, якія Мікола Васільевіч прыводзіць у прыклад: *«У адзенні не абслугоўваем»* або *«Боты вырабляюцца са скуры заказчыка»*. Звычайна старшакласнікі паспяхова, без дапамогі настаўніка выпраўляюць памылкі: *«Па пытаннях пашыву адзення не абслугоўваем»* і *«Боты вырабляюцца са скуры, прынесенай заказчыкам»*.

Пасля вывучаецца наступная частка правіла, у якой М.В. Абабурка знаёміць вучняў з паняццем *лагічнасць маўлення* і дае наступнае азначэнне: «*Маўленне з'яўляецца лагічным, калі сэнсавыя сувязі паміж яго асноўнымі*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*элементамі (словамі, словазлучэннямі, сказамі) адпавядаюць законам логікі, законам мыслення* [2, с. 209]. У старшакласнікаў ёсць магчымасць асэнсаваць як ствараецца пэўная думка. на чым грунтуецца лагічнасць маўлення. якія лінгвістычныя сродкі забяспечваюць лагічнасць маўлення.

Яшчэ раз вучні 11 класа пазнаёмяцца з патрабаваннямі да культуры маўлення, акрэсленымі М.В. Абабуркам, пры разглядзе тэмы «Багацце маўлення». У вучняў ужо назапашаны пэўныя тэарэтычныя звесткі і вопыт па культуры маўлення для прымянення іх пры аналізе сказаў (або тэксту), таму ім прапануецца пераказаць сцісла тэкст, які змешчаны пад ужо вядомым умоўным абазначэннем "!". Мэтанакіравана тут правесці з вучнямі дыялог і адказаць на наступныя пытанні: «Ад чаго залежыць багацце ці беднасць маўлення?»; «На аснове чаго вызначаецца багацце маўлення?»; «У якіх стылях дапускаецца спрошчанасць маўлення. і магчымасць шматлікіх паўтораў, а ў якіх – не?». Далей вучні знаходзяць асноўную думку тэксту, якая заключаецца ў наступным: «Багацце маўлення – гэта не толькі развіццё сінанімікі і варыянтнасці літаратурнай мовы. але і ўменне карыстацца ўсім скарбам нацыянальнай мовы. найперш апрабаванымі ўжо сінонімамі і варыянтамі».

Варта заўважыць. што прапанаваны ў вучэбных дапаможніках для 10 і 11-х класаў па беларускай мове матэрыял па культуры маўлення, падрыхтаваны М.В. Абабуркам, карысны для старшакласнікаў, таму што:

– вучыць вырашаць камунікатыўныя задачы ў сучасным свеце, калі жывое маўленне зведзена да мінімуму, абмежавана інтэрнэтам, пазбаўленым жывога маўлення;

– змяшчае багатыя звесткі па тэме “Дакладнасць, лагічнасць, багацце маўлення”;

– дэманструе сучасным дзецям, як развіваць і ўдасканальваць сваю маўленчую культуру.

**Літаратура**

1. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – 240 с.
2. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – 256 с.
3. Беларуская мова : энцыклапедыя. – Мінск, 1994. – 655 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова